7. **Высшее** партизанское командование Белоруссии, 1941–1944 : справочник / Э. Г. Иоффе [и др.]. – Минск : Беларусь, 2009. – 271 с.
8. **Партизанские** формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): краткие сведения об организационной структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / А. Л. Манаенков [и др.]. – Мінск : Беларусь, 1983. – 765 с.

# ПАРТЫЗАНСКІЯ ФАРМІРАВАННІ НА ВЕРХНЯДЗВІНШЧЫНЕ

На тэрыторыі раёна дзейнічалі 1-я і 2-я Дрысенскія, Асвейская імя М.В. Фрунзе, у якія ўваходзіла больш за 10 партызанскіх атрадаў. Атрады знішчалі нямецка-фашысцкія гарнізоны, падрывалі масты, узрывалі рэйкі і эшалоны, рабілі рэйды ў суседнія раёны.

**Вызвалены** войскамі 2-га і 1-га Прыбалтыйскіх франтоў падчас праведзеных на першым этапе аперацыі "Баграціён" Полацкай (29 чэрвеня - 4 ліпеня) і на другім этапе - Рэжыцка-Дзвінскай (10 —27 ліпеня) 1944 г. наступальных аперацый.

Баявыя дзеянні вялі войскі 21-й і 22-й армій 2-га Прыбалтыйскага фронту, 4-й ударнай арміі і злучэнні 100-га стралковага корпуса 51-й арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту.

Горад Верхнядзвінск (Дрыса) (акупаваны 08.07.1941г.) вызвалены 12.07.1944 г. часцямі 332-й стралковай дывізіі 4-й ударнай арміі; г. п. Асвея (акупаваны 01.07.1941 г.) вызвалены 17.07.1944 г. часткамі 325-й стралковай дывізіі 22-й арміі ва ўзаемадзеянні з партызанскай брыгадай імя М.Ф. Фрунзе.

ЛІТАРАТУРА

1. **Всенародная** борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / редкол.: А. Т. Кузьмин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – Т. 1 / Л. В. Аржаева [и др.] ; ред. И. М. Игнатенко [и др.]. – 591 с.
2. **Всенародная** борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / редкол.: А. Т. Кузьмин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларусь, 1984. – Т. 2 / Л. В. Аржаева [и др.] ; ред. А. А. Филимонов [и др.]. – 551 с.
3. **Всенародная** борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / редкол.: А. Т. Кузьмин [и др.]. – Минск : Беларусь, 1985. – Т. 3 / Л. В. Аржаева [и др.] ; ред. А. Н. Мацко [и др.]. – 531 с.
4. **Ивицкий, А. М.** Численность партизан Витебской области / А. М. Ивицкий // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны : зб. навук. арт. / склад.: А. А. Крыварот [і інш.]. – Минск, 2015. – С. 114–120.
5. **Иоффе, Э. Г**. Витебская область / Э. Г. Иоффе, К. И. Козак //



Агурэцкі Пётр Ігнатавіч (студзень 1944 – сакавік 1944)
**Начальнікі штаба:**
Жвірбля Сяргей Іванавіч (верасень 1942 – студзень 1944)
Шыпіла Міхаіл Андрэевіч (студзень 1944 – ліпень 1944)

## Атрад ім. Г. К. Арджанікідзэ

Створаны ў ліпені 1942 г. з партызан, выдзеленых атрадам ім. М. В. Фрунзе.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 118 партызан.

**Камандзіры атрада:**
Ахмедзьяраў Галім (ліпень 1942 – студзень 1944)
Літвінаў Пётр Пятровіч (люты 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**
Маліноўскі Мікалай Паўлавіч (жнівень 1942 – лістапад 1942)
Радзівонаў Ціхан Фёдаравіч (лістапад 1942 – сакавік 1943)
Грыцкевіч Міхаіл Іванавіч (сакавік 1943 – чэрвень 1943)
Шкляраў Пётр Львовіч (чэрвень 1943 – ліпень 1944)
**Начальнікі штаба:**
Літвінаў Пётр Пятровіч (ліпень 1942 – люты 1944)
Шэф Мікалай Міхайлавіч (люты 1944 – ліпень 1944)

## Атрад ім. Р. І. Катоўскага

Арганізаваны ў верасні 1942 г. з партызан, выдзеленых атрадам ім. А. Я. Пархоменка, і жыхароў Асвейскага раёна.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 38 партызан.

**Камандзіры атрада:**
Шамаль Анатоль Андрэевіч (верасень 1942 – студзень 1944)
Бадыль Ілля Мацвеевіч (студзень 1944 – красавік 1944, загінуў)
Фадзеенка Аляксей Сяргеевіч (красавік 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**
Літвінаў Антон Ігнатавіч (верасень 1942 – красавік 1943)
Сцяпанаў Іван Іванавіч (красавік 1943 – верасень 1943)
Пятроў Андрэй Мікітавіч (люты 1944 – красавік 1944, загінуў)
Дзялкоў Мікалай Андрэевіч (красавік 1944 – ліпень 1944)
**Начальнікі штаба:**
Лукашэнка Яфім Вікенцьевіч (верасень 1942 –)
Гіруцкі Іосіф Іосіфавіч (– май 1943)
Карпаушанка Міхаіл Іванавіч (чэрвень 1943 – ліпень 1943)

## Атрад ім. М.В. Фрунзе

Утвораны ў Асвейскім раёне ў красавіку 1942 г. з удзельнікаў падпольных арганізацый, якія выйшлі ў лес – партыйна-камсамольскай г.п. Асвея і камсамольскай в. Прошкі. Да ліпеня 1942 г. дзейнічаў самастойна.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 84 партызана.

**Камандзіры атрада:**
Захараў Іван Кузьміч (красавік 1942 – ліпень 1942)
Калайджан Ваграм Пагасовіч (жнівень 1942 – жнівень 1943)
Міхайлаў Іосіф Лук'янавіч (верасень 1943 – студзень 1944)
Смычкоў Пётр Сямёнавіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**
Петрыенка Іван Піліпавіч (красавік 1942 – жнівень 1942)
Бадыль Ілля Мацвеевіч (верасень 1942 – красавік 1943)
Смычкоў Пётр Сямёнавіч (красавік 1943 – студзень 1944)
Чарамісаў Анатоль Афанасьевіч (люты 1944 – ліпень 1944)
**Начальнікі штаба**:
Трафімаў Аляксей Іванавіч (жнівень 1942)
Ярмак Міхаіл Пятровіч (кастрычнік 1942 – студзень 1943)
Дзямідаў Аляксей Аляксеевіч (студзень 1943 – люты 1943, загінуў)
Пугачоў Васіль Раманавіч (сакавік 1943 – верасень 1943)
Кошалеў Міхаіл Георгіевіч (верасень 1943 – студзень 1944)
Бубноў Віктар Мікалаевіч (студзень 1944 – ліпень 1944)

## Атрад ім. У.У. Сімацкага

Арганізаваны ў ліпені 1942 г. з партызан, выдзеленых атрадам ім. М. В. Фрунзе. Да кастрычніка называўся ім. А.А. Жданава, пасля гібелі камандзіра атрада У.У. Сімацкага (17 кастрычніка 1942 г.) яму прысвоена яго імя.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 69 партызан.

**Камандзіры атрада:**
Сімацкі Уладзімір Уладзіміравіч (ліпень 1942 – кастрычнік 1942, загінуў)
Кузьмін Міхаіл Мікалаевіч (кастрычнік 1942 – студзень 1944)
Мацкевіч Канстанцін Якаўлевіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**
Бадыль Ілля Мацвеевіч (ліпень 1942 – верасень 1942)
Нікаленка Тамаш Аляксандравіч (верасень 1942 – студзень 1944)



Высшее партизанское командование Белоруссии, 1941–1944 : справочник / Э. Г. Иоффе [и др.]. – Минск, 2009. – С. 114–139.
6. **Иоффе, Э. Г.** К вопросу о руководстве партизанским движением в Витебской области в 1941–1944 гг. / Э. Г. Иоффе // Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны : зб. навук. арт. / склад.: А. А. Крыварот [і інш.]. – Минск, 2015. – С. 109–114.
7. **Партизанские** формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): краткие сведения об орг. структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / А. Л. Манаенков (рук.) [и др.]. – Минск, 1983. – Разд. 5 : Партизанские формирования Витебской области. – С. 220–368.

# РАСОНСКА-АСВЕЙСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ ЗОНА

**Дата існавання**: май 1942–снежань 1943 г.
**Месца:** Беларуская ССР, Віцебская вобласць, Расонскі раён, Асвейскі раён, Дрысенскі раён, Полацкі раён
**Цэнтр:** гарадскі пасёлак Расоны

**Партызанскія фарміраванні:**
**1-я Дрысенская брыгада,**
**2-я Дрысенская брыгада,**
3-я Беларуская брыгада,
4-я Беларуская брыгада,
**брыгада «Асвейская імя М. В. Фрунзе»,**
брыгада «За Савецкую Беларусь»,
брыгада «Імя К. К. Ракасоўскага»,
брыгада «Расонская імя І. В. Сталіна» і інш.

Расонска-Асвейская партызанская зона (**май 1942** – снежань 1943 г.) – вызваленая ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў тыле нямецка-фашысцкіх захопнікаў тэрыторыя Беларусі, якая ўтварылася ў выніку скаардынаваных баявых дзеянняў партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Расонскага, Асвейскага, часткі Дрысенскага і Полацкага раёнаў Віцебскай вобласці. Цэнтрам вызваленай партызанскай зоны стаў гарадскі пасёлак Расоны.

У маі 1942 г. партызаны, якія дзейнічалі на поўначы Віцебскай вобласці, разграмілі паліцэйскія ўчасткі і валасныя ўправы на тэрыторыі 10 сельсаветаў Расонскага раёна. Да кастрычніка 1942 г. народныя мсціўцы вызвалілі ад акупантаў тэрыторыю Расонскага, Асвейскага, частку Дрысенскага і Полацкага раёнаў, у тым ліку

Расоны, Асвею і мястэчка Клясціцы. У канцы 1942 г. партызаны ўтрымлівалі каля 1,8 тыс. км$^2$, вясной 1943 г. – 5 тыс. км $^2$ тэрыторыі. Вызваленая тэрыторыя стала часткай партызанскага краю, створанага рускімі, беларускімі і латышскімі партызанамі на стыку Расіі, Беларусі і Латвіі (займала 10 тыс. км$^2$, больш за 100 тыс. чалавек). З чэрвеня 1942 да снежня 1943 гг. зону абаранялі партызанскія фарміраванні Расонскага, Асвейскага, Дрысенскага раёнаў, партызанскія брыгады Калінінскай вобласці Расіі, латышскія партызанскія брыгады. Зону ўтрымлівалі брыгады Расонская імя І.В. Сталіна, Асвейская імя М.В. Фрунзе, 1-я Дрысенская, імя К.К. Ракасоўскага і іншыя. На яе тэрыторыі знаходзіліся некаторы час брыгады «За Савецкую Беларусь», 3-я і 4-я Беларускія, імя С.М. Кароткіна, 1-я і 3-я Калінінскія, латышскі атрад В.П. Самсона.

У зоне была адноўлена савецкая ўлада, базіраваліся Дрысенскі, Асвейскі, Расонскі падпольныя райкамы КП(б)Б і ЛКСМБ. У Расонскім раёне вясной 1942 г. працавалі 7 млыноў, 12 гарбарных прадпрыемстваў, 13 рамонтна-пашывачных, кавальска -такарна-слясарныя майстэрні, 7 хлебапякарняў, электрастанцыя. Падтрымлівалася двухбаковая радыёсувязь з Вялікай зямлёй. У вёсках Сяляўшчына, Роўнае Поле і Забор'е дзейнічалі партызанскія аэрадромы і пасадачныя пляцоўкі.

Гітлераўцы неаднаразова спрабавалі ліквідаваць зону. Баі па яе абароне ішлі бесперапынна з чэрвеня 1942 года. Зона пераходзіла з рук у рукі і была ператворана нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў «выпаленую зямлю». На яе тэрыторыі акупанты спалілі поўнасцю з усімі ці з большасцю жыхароў каля 100 вёсак, якія не былі адноўлены пасля вайны. Камандаваннем нямецкай групы армій «Цэнтр» перад 201-й ахоўнай дывізіяй у чэрвені 1942 г. была пастаўлена задача канчаткова захапіць Расонскі раён і замацавацца ў ім. Аднак першыя ж спробы карнікаў уварвацца ў зону з поўдня і ўсходу былі спынены партызанскімі атрадамі, якімі кіраваў аб'яднаны штаб партызанскіх атрадаў Расонскага раёна на чале з Р.А. Ахоцiным і В.Я. Лапенкам.

У ліпені гітлераўцы павялі наступленне паміж станцыямі Полацк і Дрэтунь з поўначы і з поўдня ад чыгункі Полацк – Невель. На ўсіх напрамках гітлераўскія захопнікі былі спынены, а потым адкінуты на зыходныя пазіцыі сіламі партызанскіх атрадаў брыгады «Расонская імя І. В. Сталіна». Найбольш кровапралітныя баі па абароне зоны ад карнікаў летам – восенню 1942 г. адбываліся ў раёне вёсак Асёткі Асвейскага раёна, Рум, Прудок, Краснаполле Расонскага раёна.



Макарскі Эдуард Антонавіч (май 1944 – ліпень 1944)

## Атрад ім. Аляксандра Неўскага

Утвораны ў канцы ліпеня 1942 г. з жыхароў Дрысенскага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 64 партызаны.

**Камандзіры атрада:**
Цыганкоў Якаў Дзмітрыевіч (жнівень 1942 – ліпень 1943)
Шчарбакоў Барыс Ніканоравіч (май 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**
Поснікаў Аляксандр Сяргеевіч (жнівень 1942)
Базыленка Канстанцін Д. (імя па бацьку не ўстаноўлена) (жнівень 1942 – верасень 1942, загінуў)
Нікулін Уладзімір Сяргеевіч (верасень 1942 – кастрычнік 1942)
Кралько Пётр Казіміравіч (кастрычнік 1942 – ліпень 1944)
**Начальнікі штаба:**
Арышаў Васіль Трафімавіч (ліпень 1942 – красавік 1944)
Быкаў Пётр Іванавіч (май 1944 – ліпень 1944)

## Атрад «КІМ»

Арганізаваны ў верасні 1942 г. з партызан, выдзеленых брыгадай. У канцы снежня 1943 г. у складзе 157 партызан выйшаў у савецкі тыл і расфармаваны.

**Камандзір атрада**
Галубкоў Іван Рыгоравіч (верасень 1942 – снежань 1943)
**Камісары:**
Поснікаў Аляксандр Сяргеевіч (верасень 1942 – чэрвень 1943)
Бохан Антон Адольфавіч (чэрвень 1943 – снежань 1943)
**Начальнік штаба**
Гардзей Уладзімір Уласавіч (верасень 1942 – снежань 1943)

## Атрад ім. У.І. Леніна

Створаны ў ліпені 1943 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 84 партызаны.

**Камандзір атрада**
Дзеліжонак Сцяпан Дзмітрыевіч (ліпень 1943 – ліпень 1944)
**Камісар**
Беладзедаў Пётр Фаміч (ліпень 1943 – ліпень 1944)
**Начальнікі штаба:**
Макараў Фёдар Мацвеевіч (ліпень 1943 – лістапад 1943, загінуў)
Горкаўскі Антон Паўлавіч (лістапад 1943 – ліпень 1944)

Арлоўскі Уладзімір Мікалаевіч (кастрычнік 1943 – студзень 1944)
Казачонак Пётр Максімавіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Начальнік штаба**
Марозаў Сяргей Паўлавіч (кастрычнік 1943 – студзень 1944)

## Атрад ім. А.В. Суворава

Арганізаваны ў ліпені 1942 г. Да жніўня 1942 г. называўся ім. М.В. Фрунзе.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 62 партызана.

**Камандзіры атрада:**
Грыгор'еў Афанасій Ісакавіч (сакавік 1943 – студзень 1944)
Собалеў Ілля Мікалаевіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**
Лісоўскі Аляксандр Іосіфавіч (ліпень 1942 – лістапад 1942)
Рабцаў Фёдар Андрэевіч (лістапад 1942 – студзень 1944)
Свінцілаў Андрэй Мікітавіч (люты 1944 – ліпень 1944)
**Начальнікі штаба:**
Шушпанаў Аляксандр Сямёнавіч (ліпень 1942 – )
Шыбаеў Аляксандр Аляксеевіч (сакавік 1943 – май 1943)
Кузміцкі Канстанцін Пятровіч (май 1943 – студзень 1944)
Урбан Міхаіл Васільевіч (студзень 1944 – чэрвень 1944, загінуў)
Лоўчыноўскі Яўген Аляксандравіч (чэрвень 1944 – ліпень 1944)

## Атрад ім. С. М. Кірава

Створаны ў канцы ліпеня 1942 г. з жыхароў Дрысенскага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 48 партызан.

**Камандзіры атрада:**
Свінцілаў Андрэй Мікітавіч (жнівень 1942 – снежань 1942)
Грыгор'еў Афанасій Ісакавіч (снежань 1942 – сакавік 1943)
Габелка Павел Яфімавіч (сакавік 1943 – студзень 1944)
Гардзей Уладзімір Уласавіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**
Жалезноў Васіль Цімафеевіч (жнівень 1942 – студзень 1944)
Палявечка Іван Мікалаевіч (май 1944 – ліпень 1944)
**Начальнікі штаба:**
Красноў Генадзь Міхайлавіч (жнівень 1942 – кастрычнік 1942)
Хаткевіч Антон Раманавіч (кастрычнік 1942 – чэрвень 1943)
Собалеў Ілля Мікалаевіч (чэрвень 1943 – студзень 1944)



Карныя аперацыі, якія праводзіліся гітлераўцамі ў гэты перыяд таксама правалiліся. У студзені 1943 г. захопнікі зрабілі новую спробу – масіраваным ударам з боку возера Асвейскае на захадзе і ад чыгункі Полацк – Невель на ўсходзе сціснуць партызанскія сілы паміж рэкамі Свольна і Дрыса, адрэзаць шляхі адыходу ў паўднёвых напрамках і разграміць іх. Да 11 лютага партызаны стрымлівалі карнікаў на загадзя падрыхтаваных рубяжах абароны, потым без аператыўнай паўзы перайшлі ў наступленне і выгналі ворага з зоны. Аднак гітлераўцы падцягнулі новыя сілы і 14 лютага пачалі наступленне. Каб пазбегнуць барацьбы на двух франтах, партызаны нанеслі на Расонска-Дрэтунскім напрамку вырашальны апераджальны контрудар па ўсходняй групоўцы праціўніка. Заходняй, больш моцнай, групоўцы партызаны процiпаставілі тактыку актыўнай абароны, абяскроўлівалі ворага на загадзя падрыхтаваных рубяжах, рухомыя групы партызан наносілі ўдары па тылах і камунікацыях карнікаў.

З мэтай больш аператыўнай каардынацыі дзеянняў партызан быў створаны аб'яднаны штаб партызанскіх сіл. Паводле загаду штаба асноўныя сілы партызан і тысячы жыхароў Асвейскага раёна пачалі адыход за р. Свольна. Апошні рубеж абароны працягласцю больш за 30 км па фронце быў створаны партызанамі і насельніцтвам на ўсходнім беразе р. Свольна ад в. Лісна да в. Дзёрнавічы. Да 20 сакавіка 1943 г. партызаны стрымлівалі націск ворага, а потым самі перайшлі ў наступленне і праз некалькі дзён поўнасцю ачысцілі ад ворага большую частку Асвейскага і Дрысенскага раёнаў. Восенню 1943 г. гітлераўскае камандаванне пачало распрацоўку яшчэ больш буйной карнай аперацыі супраць Расонска-Асвейскай партызанскай зоны. 31 кастрычніка пачалося новае буйное наступленне варожых войск, абарончыя баі партызан супраць намнога большых сіл праціўніка працягваліся да 9 лістапада 1943 г. Ворагу ўдалося пацяснiць партызан і захапіць Расоны, Клясціцы, Межава, рассячы зону з поўначы на поўдзень, стварыць так званы расонскі «кацёл». Наступальныя дзеянні войск 1-га Прыбалтыйскага фронту на некаторы час прыпынілі развіццё карнай аперацыі. Аднак 20 снежня гітлераўцы падцягнулі з фронту новыя сілы і пачалі баявыя дзеянні супраць партызан у Асвейскім і Дрысенскім раёнах, а таксама ў паўднёвай частцы Себежскага раёна Пскоўскай вобласці. Праціўнік імкнуўся прыцiснуць партызан да ракі Нішча і з дапамогай франтавых часцей знішчыць партызанскія сілы і тысячы адступаючых разам з імі мірных жыхароў. Гітлераўцы вялі наступленне шырокім фронтам у тры эшалоны, значна пераважалі

партызан у сілах. Аднак партызанам удалося прарваць кальцо блакады і 30 снежня 1943 г. выйсці ў размяшчэнне часцей Чырвонай Арміі. Пад аховай партызан у раён возера Страдань выйшла каля 10 тысяч жанчын і дзяцей.

Стойкай абаронай зоны народныя мсціўцы ў баявой садружнасці з партызанамі Калінінскай вобласці і Латвіі выратавалі дзясяткі тысяч жыхароў, нанеслі цяжкія страты захопнікам, пастаянна ўносілі дэзарганізацыю ў забеспячэнне левага фланга нямецкай групы армій «Цэнтр», перашкаджалі вывозіць да чыгункі збожжа, мяса. У выніку наступлення савецкіх войск значная частка зоны апынулася ў прыфрантавой паласе, і з студзеня 1944 г. дзеянні партызан на яе тэрыторыі насілі пераважна разведвальна-дыверсійны характар.

ЛІТАРАТУРА

1. **Гэтых** дзён не змоўкне слава //Дзвінская праўда. – 1972. – 25 мая. – с.2.
2. **Дзмітрыеў, С.** Мы выстаялі. Партызанскі рух /С. Дзмітрыеў // Дзвінская праўда. – 1995. – 30 чэрвеня. – с.2.
3. **«Зимнее волшебство».** Нацистская карательная операция в белорусско-латвийском приграничье, февраль – март 1943 г. : документы и материалы / [редкол.: В. И. Адамушко и др.]. –М. : Минск : Фонд «Историческая память», 2013. – 512 с. – (Восточная Европа. XX век).
4. **Калайджян, В.П.** В тылу врага : записки партизана отряда им. М.Фрунзе /В.П. Калайджян. – Санкт-Петербург, 1998. – 128 с.
5. **Кочуров, А. И.** В Калининской бригаде воевали белорусы / А. И. Кочуров // Дзвінская праўда. - 2019. — 30 ліпеня. — С. 6.
6. **Краўчанка, Н. Г.** Дзёрнавіцкія партызанкі / под ред. Т. Н. Адамян // Женский подвиг в истории Беларуси. 1917-2017 годы : материалы Международной научно-практической конференции. - Минск : УП "Энциклопедикс", 2018. - С. 141-147.
7. **Нескароны** край // Памяць: Верхнядзвінскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.] ; уклад. А. Ф Бубала ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Паліграфафармленне, 1999. – Кн. 1. – С. 240–272.
8. **Партизанские** зоны // Беларусь партизанская = Guerrilla Belarus : иллюстрированная энциклопедия партизанского движения в Беларуси в годы Великой Отечественной войны / под общ. ред. А. М. Литвина ; пер. на англ.: А. В. Титова, Н. Ю. Жданова. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2019. – С. 91–101. – (Беларусь помнит: во имя



# АТРАДЫ

## 1-ы Калінінскі атрад

Арганізаваны ў ліпені 1942 г. з жыхароў Дрысенскага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 61 партызана.

**Камандзіры атрада:**
Кухарэнка Іван Міхайлавіч (ліпень 1942 – кастрычнік 1943)
Харкевіч Іван Яфімавіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**
Бохан Антон Адольфавіч (ліпень 1942 – чэрвень 1943)
Жыгач Мікалай Іванавіч (чэрвень 1943 – кастрычнік 1943)
Прозараў Лук'ян Цімафеевіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Начальнікі штаба:**
Чувахін Сямён Аляксеевіч (ліпень 1942 – красавік 1943, загінуў)
Касач Аляксандр Канстанцінавіч (красавік 1943 – кастрычнік 1943)
Несцярэнка Уладзімір Аляксандравіч (студзень 1944 – ліпень 1944)

## 2-і Калінінскі атрад

Утвораны ў пачатку ліпеня 1943 г. з жыхароў в. Залессе, Клімаўшчына, Горнава, Асінаўка Дрысенскага раёна.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 63 партызана.

**Камандзіры атрада:**
Іваннікаў Генадзь Міхайлавіч (ліпень 1943 – студзень 1944)
Цэхановіч Аляксандр Аляксандравіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Камісар**
Брыль Уладзімір Грыгор'евіч (лістапад 1943 – ліпень 1944)
**Начальнікі штаба:**
Цэхановіч Аляксандр Аляксандравіч (ліпень 1943 – студзень 1944)
Пястоўскі Васіль Васільевіч (студзень 1944 – ліпень 1944)

## 3-і Калінінскі атрад

Сфарміраваны ў канцы кастрычніка 1943 г. з партызан, выдзеленых 1-м і 2-м Калінінскім атрадамі, і жыхароў Дрысенскага раёна.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 60 партызан.

**Камандзір атрада**
Арлоўскі Уладзімір Мікалаевіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**

рования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, (июнь 1941–июль 1944): краткие сведения об организационной структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / авт. кол.: А.Л. Манаенкова [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – С. 277–281.
14. **Пакульневіч, Я.** «Праявіў знаходлівасць, адвагу і мужнасць» / Я. Пакульневіч // Дзвінская праўда. – 1985. – 23 крас. – С. 2.
15. **Партызанская** брыгада Асвейская імя М.В. Фрунзе // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 419–420.
16. **Политдонесение** секретаря Освейского подпольного райкома КП(б)Б П. П. Кузьминова Витебскому подпольному обкому КП(б)Б о росте партизанских сил, подпольных организаций, политической работе и боевой деятельности партизанских отрядов, действовавших в Освейском районе с 1 по 28 августа 1943 г. // Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, июнь 1941–июль 1944: документы и материалы : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1978. – Т. 2. Кн. 2 : Развитие всенародного партизанского движения во второй период войны, (июль–декабрь 1943) / редком.: А. Т. Кузьмин [и др.[ ; сост.: Г. Н. Шевела [и др.]. – С. 129–130.
17. **Русін, І.** Ад Лібавы да Лісна / І. Русін // Дзвінская праўда.- 2016.- 27 мая.- С.4
18. **Салаўёў, М.** Дарога да подзвігу / М. Салаўёў // Дзвінская праўда. – 1984. – 26 ліп. – С. 2.
19. **Шаршоў, В**. Баявое братэрства / В. Шаршоў // Віцебскі рабочы. – 1972. – 14 крас. – С. 2.
20. **Шпаковская, Г**. От Освеи до Берлина / Г. Шпаковская // Витебские вести. – 2014. – 3 июля. – С. 4.
21. **Шыпіла, М.** Прарыў / М. Шыпіла // Памяць: Верхнядзвінскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.] ; уклад. А. Ф Бубала ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Паліграфафармленне, 1999. – Кн. 1. – С. 318–319.



жизни и мира).
9. **Партызанскі** фронт // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Расонскага раёна / рэдкал.: Б. І. Сачанка [і інш.] ; маст. А. М. Хількевіч. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1994. – 115–131.
10. **Пасэ, У. С.** Расонска-Асвейская партызанская зона / У. С. Пасэ, Э. Ф. Языковіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 525–529.
11. **Слободской, Л. Х.** Братство по оружию /Л.Х. Слободской // В Братском партизанском крае.– Лениздат. - 1983. - С. 35-48
12. **Сянько, С.** Партызанскае братэрства. 1944 г./ С. Сянько // Дзвінская праўда. – 1979. – 18 чэрвеня. – с. 2.
13. **Шамаль, А.** В Сарьянских лесах /А. Шамаль. – Мн. : Беларусь, 1973. – 168 с.
14. **Языковіч, Э.Ф.** Расонска-асвейская партызанская зона/ Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. Кн. 1: Пузыны — Усая / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш.; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : БелЭн, 2001. — С. 110-111.

## 1-Я ДРЫСЕНСКАЯ БРЫГАДА

**Дата заснавання:** 07.1942 г.
**Месца дзеяння:** Віцебская вобл.: Асвейскі р-н, Дрысенскі р-н, Расонскі р-н

**Камандзіры брыгады:**
Мандрыкін Пётр Рыгоравіч ( ліпень 1942 – верасень 1942, загінуў)
Герасімаў Рыгор Пятровіч (верасень 1942 – студзень 1944)
Грыгор’еў Афанасій Ісакавіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**
Герасімаў Рыгор Пятровіч (ліпень 1942 – верасень 1942)
Шаблоўскі Фёдар Фёдаравіч (верасень 1942 – лістапад 1942)
Лісоўскі Аляксандр Іосіфавіч (лістапад 1942 – ліпень 1944)
**Начальнікі штаба:**
Рабцаў Фёдар Андрэевіч (ліпень 1942 – лістапад 1942)
Ламінскі Сяргей Фёдаравіч (лістапад 1942 – май 1943)
Шыбаеў Аляксандр Аляксеевіч (май 1943 – студзень 1944)
Кузміцкі Канстанцін Пятровіч (студзень 1944 – ліпень 1944)

**Атрады:**
Атрад імя А. В. Суворава
Атрад імя С. М. Кірава

Атрад імя Аляксандра Неўскага
Атрад «КІМ»
Атрад імя У. І. Леніна

У ліпені 1942 г. у Дрысенскі раён камандаваннем брыгады «За Савецкую Беларусь» накіраваны арганізатарская група на чале з Р. П. Герасімавым і П. Р. Мандрыкіным і атрад імя Сяргея. Хуткім часам там ствараюцца новыя атрады імя М. І. Калініна, імя М. В. Фрунзе, імя С. М. Кірава, імя А. Неўскага, якія былі аб'яднаны ў дрысенскую групу партызанскіх атрадаў і далучаны да брыгады «За Савецкую Беларусь». У жніўні да іх далучыўся атрад «Бясстрашны», які прыбыў з савецкага тылу. Паводле распараджэння аператыўнай групы партызанскага руху пры Ваенным савеце 4-й ударнай арміі ад 26 жніўня 1942 г. гэта група атрадаў вызначана як Дрысенская партызанская брыгада (з 1 кастрычніка 1943 г. 1-я Дрысенская брыгада). Атрад імя Сяргея застаўся ў брыгадзе «За Савецкую Беларусь». Пазней у складзе Дрысенскай брыгады створаны атрады «КІМ», імя У. І. Леніна і імя М.І. Кутузава. Паводле распараджэння БШПР у лютым 1943 г. атрад «Бясстрашны» вылучаны ў самастойны, у кастрычніку атрады імя М.І. Калініна і імя М.І. Кутузава перададзены для фарміравання 2- Дрысенскай брыгады.

Пасля цяжкіх баёў з карнікамі напрыканцы снежня 1943 г. брыгада ў складзе атрадаў імя А.В. Суворава, імя С.М. Кірава, імя У.І. Леніна, «КІМ» і імя А. Неўскага, агульнай колькасцю 729 чалавек, выйшла ў савецкі тыл і была рэарганізавана. У студзені 1944 г. яна ў складзе 4 атрадаў са 153 чалавек вярнулася ў раён баявых дзеянняў, дзе аб'ядналася са 127 партызанамі сваёй брыгады, што заставаліся тут у варожым тыле.

Брыгада дзейнічала ў Асвейскім, Дрысенскім і Расонскім раёнах. Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгунцы Полацк – Даўгаўпілс, шашэйных і грунтавых дарогах Полацк – Расоны, Асвея – Полацк, Дрыса – Асвея, Клясціцы – Полацк, Себеж – Полацк і інш. Разам з брыгадамі Асвейскай імя Фрунзе і «За Савецкую Беларусь» правялі аперацыю па адначасовым разгроме варожых гарнізонаў на чыгуначных станцыях Боркавічы і Дрыса (кастрычнік 1942 г.). У студзені 1943 г. удзельнічалі ў разгроме гарнізона ў в. Вецслабада Латвійскай ССР (Вецслабадскі бой 1943 г.). У сакавіку 1943 г. напалі на варожыя гарнізоны ў в. Маторына, Лешня, Юзафова, разграмілі гарнізоны в. Балдышы (красавік 1943 г.), в. Кабыльнікі (красавік 1944 г.) Дрысенскага раёна. У студзені–сакавіку, маі-снежні 1943 г., лютым-чэрвені 1944 г. вялі баі супраць карнікаў. На чыгуначным участку Боркавічы – Бігосава



кевіч. – Мінск : Паліграфафармленне, 1999. – Кн. 1. – С. 249–252.
4. **Донесение** командования Освейской партизанской бригады им. М. В. Фрунзе Витебской обл. Витебскому подпольному обкому КП(б)Б о боевой деятельности бригады за период с 5 по 28 июля 1943 г. // Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, июнь 1941–июль 1944: документы и материалы : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1978. – Т. 2. Кн. 2 : Развитие всенародного партизанского движения во второй период войны, (июль–декабрь 1943) / редком.: А.Т. Кузьмин [и др.] ; сост.: Г. Н. Шевела [и др.]. – С. 43–45.
5. **Захараў, І. К**. Брацтва, змацаванае крывёй / І. К. Захараў // Віцебскі рабочы. – 1972. – 9 мая. – С. 2.
6. **Захараў, І.** Набліжаючы радасны дзень / І. Захараў // Дзвінская праўда . – 1978. – 9 мая. – С. 2.
7. **Захараў, І.** Нязгасная памяць / І. Захараў // Звязда. – 1980. – 3 ліп. – С. 3.
8. **Захаров, И**. Война в краю озёр / И. Захаров. – 2-е, перераб. и доп. изд. – Минск : Беларусь, 1973. – 318 с.
9. **Из докладной** записки в БШПД командования партизанской бригады им. М. В. Фрунзе Витебской обл. о проведении операции по подрыву железнодорожных рельсов в ночь с 3 на 4 и с 19 на 20 августа 1943 г. // Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, июнь 1941 – июль 1944: документы и материалы : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1978. – Т. 2. Кн. 2 : Развитие всенародного партизанского движения во второй период войны, (июль–декабрь 1943) / редком.: А. Т. Кузьмин [и др.] ; сост.: Г. Н. Шевела [и др.]. – С. 110–111.
10. **Из указа** Президиума Верховного Совета СССР о присвоении звания Героя Советского Союза белорусским партизанам // Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, июнь 1941–июль 1944: документы и материалы : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1978. – Т. 3 : Всенародное партизанское движение в Белоруссии на завершающем этапе, январь–июль 1944 / редком.: А. Т. Кузьмин [и др.] ; сост.: Г. Н. Шевела [и др..]. – С. 30–31.
11. **Марачкоўскі, А**. У тыя трывожныя дні / А. Марачкоўскі // Дзвінская праўда. – 1973. – 29 сак. – С. 2.
12. **Нескароны** край // Памяць: Верхнядзвінскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.] ; уклад. А. Ф Бубала ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Паліграфафармленне, 1999. – Кн. 1. – С. 240–244.
13. **Освейская** бригада им. М. В. Фрунзе // Партизанские форми-

Разам з партызанскімі брыгадамі Дрысенскай (пазней 1-я Дрысенская) і «За Савецкую Беларусь» партызаны правялі аперацыю па разгроме варожых гарнізонаў на чыгуначных станцыях Боркавічы і Дрыса (кастрычнік 1942 г.), разграмілі гарнізоны ў в. Вецслабада (Вецслабадскі бой, студзень 1943 г.), Ксяверына Латвійскай ССР, Каханавічы, Кабыльнікі Асвейскага раёна, Глямбочына Себежскага раёна Калінінскай вобласці, Саўчонкі і Балотнікі (красавік 1943 г.) Дрысенскага раёна. Вялі баі з карнікамі ў лютым – сакавіку, лістападзе – снежні 1943 г., сакавіку – маі 1944 г. У аперацыі «рэйкавая вайна» на ўчастках Дрыса – Марцінава, Маразы – Паноры, Дрыса – Бігосава падарвалі больш за 2 тыс. рэек. У ноч на 08.07. 1944 г. з баямі захапілі бальшак Полацк – Асвея каля в. Маскалёнкі – Стралкі і не давалі магчымасці ворагу адступаць. Брыгада дзейнічала ў Асвейскім, Дрысенскім, Расонскім раёнах Віцебскай вобласці. Злучэнне з часцямі Чырвонай арміі адбылося 13 ліпеня 1944 г. у складзе 4 атрадаў (імя М.В. Фрунзе, імя У.У. Сімацкага, імя Г.К. Арджанікідзэ, імя Г.І. Катоўскага) агульнай колькасцю 345 партызан.

Камандзіру брыгады І.К. Захараву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У 1964 г. у в. Марачкова Расонскага раёна ў гонар брыгады насыпаны курган, пастаўлены абеліск, у 1962 г. у г. Верхнядзвінску і ў 1975 г. у г. п. Асвея ў гонар брыгады ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Асвейкая** брыгада імя М.В. Фрунзе // Памяць: Верхнядзвінскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.] ; уклад. А. Ф Бубала ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Паліграфафармленне, 1999. – Кн. 1. – С. 245 –248.
2. **Бухнер, А. В.** Деятельность подпольных организаций и партизанских отрядов на Освейщине в годы Великой Отечественной войны / А. В. Бухнер, Е. В. Глазырин // Инновационное развитие Придвинского края : региональная научно-практическая конференция студентов, магистрантов и аспирантов, 18–19 декабря 2007 г. : сборник научных трудов / редкол.: Д. Н. Лазовский [и др.]. – Новополоцк : ПГУ, 2007. – С. 59–65.
3. **Дакументы** сведчаць // Памяць: Верхнядзвінскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.] ; уклад. А. Ф Бубала ; маст. Э. Э. Жа-



падарвалі і пашкодзілі больш за 2 тысячы рэек.

Злучэнне з часцямі Чырвонай арміі адбылося 12 ліпеня 1944 г. у складзе 4 атрадаў (атрад імя А. В. Суворава, атрад імя С. М. Кірава, атрад імя А. Неўскага, атрад імя У. І. Леніна) агульнай колькасцю 281 партызан.

У 1964 г. у в. Маторына Расонскага раёна ў гонар брыгады насыпаны курган, пастаўлены абеліск. У 1970 г. у в. Дзёрнавічы Верхнядзвінскага раёна пастаўлена стэла.

## ЛІТАРАТУРА

1. **1-я Дриссенская** бригада // Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, (июнь 1941–июль 1944): краткие сведения об организационной структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / авт. кол.: А. Л. Манаенкова [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – С. 274–275.
2. **Арлоўскі, В**. Так нараджаліся атрады / В. Арлоўскі // Дзвінская праўда. – 1975. – 30 студз. – С. 2.
3. **Бардадын, А. Ф**. Бои на реке Свольна (январь–май 1943) / А. Ф. Бардадын // Из истории партизанского движения в Белоруссии, (1941–1944 гг.) : сборник воспоминаний / отв. ред. И. С. Кравченко [и др.]. – Минск : Госиздат БССР, 1961. – С. 41–50.
4. **Грыгор'еў, А**. Аперацыя «Мост» / А. Грыгор'еў // Дзвінская праўда. – 1975. – 4 сак. – С. 2.
5. **Грыгор'еў, А.** Маланкі ўначы / А. Грыгор'еў // Дзвінская праўда. – 1974. – 23 лют. – С. 2–3.
6. **Грыгор'еў, А**. Не змоўкне слава / А. Грыгор'еў // Дзвінская праўда. – 1964. – 11 ліп. – С. 2.
7. **Грыгор'еў, А**. Расла партызанская слава / А. Грыгор'еў // Дзвінская праўда. – 1984. – 19 крас. – С. 2.
8. **Грыгор'еў, А.** Так ствараласся брыгада / А. Грыгор'еў // Дзвінская праўда. – 1984. – 6 сак. – С. 2.
9. **Грыгор'еў, А**. У тыя векапомныя дні / А. Грыгор'еў // Дзвінская праўда. – 1974. – 6 чэрв. – С. 2.
10. **Місюк, А.** На вогненнай зямлі / А. Місюк // Дзвінская праўда. – 1977. – 7 лістап. – С. 2.
11. **Міхасевіч, І.** Партызанская маці / І. Міхасевіч // Дзвінская праўда. – 1974. – 25 чэрв. – С. 2.
12. **Партызанская** брыгада 1-я Дрысенская // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 401.

13. **Урбан, Р**. Зброевых спраў майстар / Р. Урбан. // Дзвінская праўда. – 1995. – 20 студз. – С. 2.
14. **Цалпан, А.** Не было оккупантам покоя / А. Цалпан // Дзвінская праўда. – 2009. – 23 чэрв. – С. 2.

## 2-Я ДРЫСЕНСКАЯ БРЫГАДА

Створана 4 кастрычніка 1943 г. згодна з загадам БШПР на базе атрадаў ім. М. І. Калініна і ім. М.І. Кутузава, вылучаных 1-й Дрысенскай брыгадай. Атрады былі перайменаваны ў 1-ы Калінінскі і 2-і Калінінскі, пазней створаны 3-і Калінінскі. У канцы снежня 1943 г. у выніку баёў з карнікамі брыгада ў складзе 1-га і 2-га Калінінскіх атрадаў (245 чел.) выйшла ў савецкі тыл, дзе была расфарміравана. 16 студзеня 1944 г. камандны склад брыгады з падраздзяленнем партызан (92 чел.) зноў прыбылі ў Дрысенскі раён, дзе злучыліся з 3-м Калінінскім атрадам, які працягваў дзейнічаць тут.

Брыгада дзейнічала ў Дрысенскім і Расонскім раёнах.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 12 ліпеня 1944 г. у складзе 3 атрадаў агульнай колькасцю 230 партызан.

| | |
|---|---|
| жанчын – 8 | |
| беларусаў –160 | членаў ВКП(б) – 4 |
| рускіх – 35 | кандыдатаў – 18 |
| украінцаў – 3 | членаў УЛКСМ – 45 |
| другіх нац.– 32 | беспартыйных – 163 |
| з іх мужчын – 222 | |

**Камандзір брыгады**
Кухарэнка Іван Міхайлавіч (кастрычнік 1943 — ліпень 1944*)*
**Камісар**
Хут Ісхак Вацігежавіч (кастрычнік 1943 — ліпень 1944*)*
**Начальнік штаба**
Касач Аляксандр Канстанцінавіч (кастрычнік 1943 — ліпень 1944)

## АСВЕЙСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ М.В. ФРУНЗЕ

**Дата заснавання:** 07.1942
**Месца дзеяння:** Віцебская вобл.: Асвейскі р-н, Дрысенскі р-н, Расонскі р-н

**Камандзіры брыгады:**
Захараў Іван Кузьміч (ліпень 1942 – студзень 1944)



Кузьмін Міхаіл Мікалаевіч (студзень 1944 – ліпень 1944)
**Камісары:**
Уладзіміраў Віталь Піліпавіч (ліпень 1942 – сакавік 1943, загінуў)
Сяргушка Антон Іванавіч (сакавік 1943 – студзень 1944)
Бохан Антон Адольфавіч (студзень 1944 – чэрвень 1944)
**Начальнікі штаба:**
Мядзведзеў Анатоль Данілавіч (ліпень 1942 – верасень 1942)
Трафімаў Аляксей Іванавіч (верасень 1942 – сакавік 1943)
Радзівонаў Ціхан Фёдаравіч (сакавік 1943 – студзень 1944)
Ахмядзьяраў Галім (люты 1944 – ліпень 1944)
**Атрады:**
Атрад імя Г. К. Арджанікідзэ
Атрад імя А. А. Жданава
Атрад імя Г. І. Катоўскага
Атрад імя У. У. Сімацкага
Атрад імя М. В. Фрунзе
2-і атрад імя М. В. Фрунзе

У ліпені 1942 г. у Асвейскім раёне камандаваннем атрада імя. М.В. Фрунзе, які дзейнічаў тут з вясны 1942 г., былі створаны атрады імя А.А. Жданава (пазней імя У.У. Сімацкага), імя Г.К. Арджанікідзэ, імя А. Я. Пархоменкі. Новыя арганізаваныя і атрад імя М.В. Фрунзе былі аб’яднаныя ў асвейскую групу партызанскіх атрадаў і далучаны да брыгады «За Савецкую Беларусь» (пазней брыгада імя К.К. Ракасоўскага Вілейскай вобласці). Згодна з распараджэннем аператыўнай групы партызанскага руху пры Ваенным савеце 4-й ударнай арміі ад 26 жніўня 1942 г. гэта група атрадаў названа Асвейскай брыгадай імя М.В. Фрунзе. Атрад імя А.Я. Пархоменкі застаўся ў брыгадзе «За Савецкую Беларусь» (1-ы атрад імя А.Я. Пархоменкі брыгады імя ЦК КП(б)Б Вілейскай вобласці). Пазней у Асвейскай брыгадзе імя М.В. Фрунзе былі арганізаваны атрады імя Г.І. Катоўскага, імя А.А. Жданава, 2-і імя М.В. Фрунзе. У канцы снежня 1943 г. пасля цяжкіх баёў з карнікамі брыгада (1169 чалавек) у складзе атрадаў імя М.В. Фрунзе, 2-га імя М.В. Фрунзе, імя У.У. Сімацкага, імя А.А. Жданава і імя Г.І. Катоўскага выйшла да савецкага тылу і была рэарганізавана. У лютым 1944 г. яна ў складзе атрадаў імя М.В. Фрунзе, імя У.У. Сімацкага і імя Г.І. Катоўскага, агульнай колькасцю 206 чалавек, вярнулася ў раён баявых дзеянняў. Тут да яе далучыўся атрад імя Г.К. Арджанікідзэ, які не выходзіў у савецкі тыл.